

# Пяць жанчын-мастакоў — пяць паралельных гісторый

***У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" пачала працаваць выстава жывапісу і графікі "Паралельныя гісторыі". У экспазіцыі прадстаўлены творы пяці беларускіх жанчын-мастакоў — Алы Кушнер, Наталлі Каржыцкай, Наталлі Шапавалавай, Марыны Канавалавай і Юліі Нявейка. Што аб'ядноўвае іх — такіх розных па ўзросце, па сваёй жаночай прыгажосці, па месцы нараджэння ад Крычава да Нарыльска і, вядома ж, па сваёй мастацкай манеры?***



М.Канавалава. "Гарадскі пейзаж у стылі Утрыла".

Куратар выставы вядомы мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн заўважыла на вернісажы, што хоць прадстаўленыя на выставе мастакі ўяўляюць сабой згуртаваны калектыў, але ў творчасці яны жывуць кожная сваім абсалютна самастойным жыццём, удзельнічаюць у розных выставах, па-рознаму знаходзяць сябе ў мастацтве. Невыпадкова выстава атрымала назву "Паралельныя гісторыі". Як вядома, паралельныя ніколі не перасякуцца.

Ларыса Давідаўна дала кароткія характарыстыкі кожнай з удзельніц выставы. Ала Кушнер: самы моцны бок яе мастацтва — гэта ўменне працаваць з фактурамі, а фактура, як вядома, з'яўляецца формаўтваральным элементам. Марына Канавалава: незвычайная мяккая паэзія пастэлі, лірычная пастэльная натура, якая, аднак, валодае вельмі моцнай энергіяй. Наталля Шапавалава: надзвычай шырокая палітра прыёмаў ад тонкай дэталізацыі да лёгкага дотыку да палатна. Юлія Нявейка: вельмі кантрасная манера — паміж светлым і цёмным, паміж жанчынай-маці і жанчынай-вамп. Наталля Каржыцкая: суцэльная рамантыка і зямны постімпрэсіяністцкі рай з рамантычнымі доўгавалосымі жанчынамі, рамантычнымі пейзажамі, рамантычнымі нацюрмортамі.

Мастацтвазнаўца і гісторык мастацтва, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Яўген Шунейка ў сваю чаргу быў сам метафарычны ў ацэнцы творчасці мастакоў: "У Блока ёсць паэма "12". А сёння мы гаворым пра паэму "5". Гэта пяць розных творчых сцяжынак, пяць розных характараў, пяць розных талентаў, пяць розных адкрыццяў нечага важнага.



Н.Каржыцкая. "Нацюрморт з апельсінамі".



Ю.Нявейка. "Песня сірэны".

Гэта культура свабоды, гэта культура традыцый, якія ідуць поруч з наватарствам. Кожны з гэтых мастакоў бачыць свет вельмі асабліва. І венецыянскія гандолы тут зусім не тыя, якія бачаць турысты, і Нясвіж тут зусім не той Нясвіж, па якім мы ходзім падчас экскурсій, і нават яблыкі прымаюць зусім незвычайны вобраз... Ва ўсялякім разе ўсе гэтыя жанчыны-мастакі паказваюць вельмі добры прыклад іншым жанчынам, якія яшчэ толькі шукаюць сябе ў мастацтве".

Дарэчы, і Ларыса Фінкельштэйн, і Яўген Шунейка настойліва называлі прадстаўленых на выставе творцаў не мастачкамі, а менавіта мастакамі. Ларыса Давідаўна напрост сказала: "Не люблю я гэтага слова — "мастачка". Яны не мастачкі, а мастакі. Наогул, няма жаночага ці мужчынскага мастацтва. Ёсць або мастацтва, або немастацтва. А тут сёння менавіта мастацтва".

Але вернемся да нашага першапачатковага пытання: што аб'ядноўвае іх — такіх розных?

Не толькі тое, што ўсе яны — жанчыны-мастакі. І не толькі тое, што ёсць у іх адзін любімы пленэр, у якім яны разам удзельнічаюць ужо не першы год, — "Лета ў правінцыі" пад Смалявічамі.

Адна з удзельніц выставы Марына Канавалава прызналася, што спачатку экспазіцыю меркавалася назваць "Паролі": "Нам хацелася, каб глядач разгадаў пароль кожнай з нас. Бо творчы працэс — гэта заўсёды двухбаковы рух. З боку мастака — гэта раскрыццё свайго захаплення светам і адкрыццё свету ў сабе. Тут і пішацца "пароль" з зашыфроўкай уражанняў і пачуццяў сваёй індывідуальнай аўтарскай мовай. З боку гледача — гэта імкненне зразумець, што хацеў сказаць мастак".



Н.Шапавалава. "1913".



А.Кушнер. "Мікулае побач".

Дарэчы, па словах Марыны Канавалавай, канцэпцыя пароляў прыдумвалася крыху ў незвычайных умовах. Аднойчы яны сабраліся ўпяцёх у рыжскай кавярні, пілі каву, весела шчабяталі пра сваё жаночае і пра ўсіхняе мастацкае. А потым, як у добрым фільме, узялі дый напісалі канцэпцыю выставы... на кафэшных сурвэтках.

Пяць жанчын-мастакоў, пяць паралельных гісторый, пяць пароляў... Вось гэта найперш іх і аб'ядноўвае — усе яны паролі, загадкі, якія трэба разгадаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ